падзеі вайны 1812 года, рэальны беларускі гістарычны герой – М. Агінскі, ды і ажылі не беларусы (аўтар не трывожыць памяць продкаў, як і У. Караткевіч), а непахаваныя французы.

Апошні хорар, які ўбачылі беларусы ў 2019 годзе,- гэта фільм "Упыры", пракат якога таксама стаў падзеяю. Аўтары фільма стварылі атмасферны хорар: Купальская чароўная ноч, забытае Богам і людзьмі возера, патрывожаны спакой бяспечнай моладзі, бандыты… і ажыўшая нечысць. Зомбі хапаюць раптоўна з любой лясной лужыны, прагнуць чалавечай крыві. Сапраўдны зомбі-хорар, звязаны з традыцыйным беларускім святам Купалля.

Для зручнасці пошуку твораў у жанры хорар у інтэрнэце намі створана старонка, прысвечаная беларускаму хорару. Гэта вынік прыкладнога прымянення праведзенай даследчай працы. Спадзяёмся, што старонка стане папулярнай у аматараў жаху, падштурхне грамадскасць да чытання беларускіх твораў і да вывучэння ўсяго беларускага.

**Заключэнне.** Прааналізаваўшы вывучаны матэрыял, мы прыйшлі да вывадаў, што беларускі хорар вылучаецца сваёй сувяззю з нацыянальнымі традыцыямі, міфалогіяй і гісторыяй беларускіх шляхецкіх родаў.

Дадзеная праца дае падставы меркаваць, што беларуская літаратура распрацавала сваю сістэму вобразаў жахлівага, крыніцы якой мы знайшлі ў нацыянальным фальклоры, міфалогіі, але ёсць у ёй і запазычанні, адаптаваныя пад нашу традыцыю, – гэта зомбі і вобраз дзікага палявання.

УДК 821.161.3-93

Вуч. А.А. Куневіч
Навук. кір.: М.А. Акцызная, настаўніца беларускай мовы і літаратуры;
М. Ул. Карнеева, настаўніца англійскай мовы,
магістр педагагічных навук (ДУА "Сярэдняя школа № 7 г. Баранавічы")

## ЭМАЦЫЙНА-ЭКСПРЭСІЎНАЯ ЗНАЧНАСЦЬ ПАМЯНШАЛЬНА-ЛАСКАЛЬНЫХ СУФІКСАЎ У БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ПАЭЗІІ РОЗНЫХ ПЕРЫЯДАЎ

Характэрнай асаблівасцю беларускай мовы з'яўляецца наяўнасць у ёй вялікай колькасці памяншальна-ласкальных слоў. Памяншальна-ласкальная форма, як правіла, утвараецца пры дапамозе спецыяльных суфіксаў. Вельмі часта пры дапамозе гэтых марфем мы можам перадаць свае эмоцыі і адносіны да таго, пра што гаворым. У

дадзенай працы наша ўвага накіравана на эмацыйна-экспрэсіўную значнасць памяншальна-ласкальных суфіксаў у беларускай дзіцячай паэзіі.

Мэта навуковай працы: высветліць асаблівасці эмацыйна-экспрэсіўнай афарбаванасці і магчымасці памяншальна-ласкальных суфіксаў у беларускай дзіцячай паэзіі розных перыядаў.

У сваё рабоце мы вырашылі зрабіць аўтарскім аналіз памяншальна-ласкальных суфіксаў у дзіцячай паэзіі розных перыядаў на прыкладзе вершаў Якуба Коласа, Рыгора Барадуліна, Алеся Бадака.

Асноўная ўмова прыгажосці і сілы літаратурнай мовы Якуба Коласа – творчы адбор моўных сродкаў выразнасці. Характэрнай асаблівасцю вершаў паэта з'яўляецца выкарыстанне памяншальна-ласкавых суфіксаў, што надае творам пяшчоту, ласку, захапленне, замілаванне.

*"**Пчолкі**, **матылёчкі,***
*Як сняжынкі тыя,*
*Мільгацяць вакол.*
*Жоўтыя **пясочкі** —*
***Крупкі** залатыя,*
*Хоць бяры ў прыпол!"*

Я.Колас з дапамогай памяншальна-ласкальных назоўнікаў і прыметнікаў стварае фон апавядання, дае пры гэтым характарыстыку сваім героям, выражае свае адносіны да іх.

Разгледзім два невялічкія вершы Р. Барадуліна «Светлячок» і «Кошачка». Вялікая колькасць памяншальна ласкальных суфіксаў у гэтых вершах указвае на тое, што яны адрасаваны самым маленькім чытачам. Пры дапамозе такой колькасці слоў з ацэначнымі суфіксамі аўтар знаёміць дзяцей з навакольным асяроддзем, вучыць беражлівасці і выхоўвае любоў да жывёл. Рыгор Барадулін дасягае такой мэты пры дапамозе памяншальна-ласкальных суфіксаў **-ок, -ачк**:

*"Гарыць чырвоны **язычок**,*
*Маўчыць шкляная **ляпачка**,*
*Не любіць цемры светлячок,*
*Які завецца –ламп**ачка**."*

Верш "Кошачка" больш разнастайны на наяўнасць памяншальна-ласкальных суфіксаў:

✓ **еньк-** у прыметніку:

***"Выгінасценькая** спінка..."*

✓ **ын, - к, - ц** у назоўніках:

***"Кошка**, цёзка, **кошка**,*

*Быццам шустрая* ***дзяўчынка***
*На чатырох* ***ножках****.*
***Як цыбулькі****, тыя* ***вочкі****,*
***Вушкі*** *– чуйныя лісточкі****,***
***Лапкі – колцамі*** *нажніцаў,*
*Хвост шаўковы –*
***Мышкам*** *сніцца.”*

Сярод прадстаўнікоў дзіцячай паэзіі 21 стагоддзя, мы вырашылі звярнуць увагу на творчасць Алеся Бадака. На наш погляд, яго вершы цесна звязана з творчым і выхаваўчым вопытам папярэдніх пакаленняў беларускіх паэтаў. А. Бадак улічвае традыцыйныя падыходы, спосабы і прыёмы, якімі карысталіся пісьменнікі ў паэтычнай творчасці для дзяцей.

Для прыкладу у вершы «Мышка» аўтар выкарыстоўвае наступныя суфіксы ў назоўніках: **-к, - ік, -еньк:**

*“Уцякала мышка*
*Ад коц****ік****а,*
*Пагубляла мышка*
*Боц****ік****і.”*
*“Ой, памерзлі ў бедн****еньк****ай*
*Ножкі,*
*Хворая ляжыць яна*
*Ў ложку.”*

Такім чынам, мы бачым, што памяншальна-ласкальныя суфіксы ў дзіцячай паэзіі А. Бадака дапамагаюць больш дакладна ахарактарызаваць тыя пачуцці, што перажывае чалавек, апісаць герояў, вызначыць сэнс і стыль тэксту.

У працэсе аналізу дзіцячай паэзіі, мы прыйшлі да наступных вывадаў, што у дзіцячых творах беларускіх аўтараў розных перыядаў шырока ўжываюцца памяншальна-ласкальныя суфіксы назоўнікаў і прыметнікаў, з дапамогай якіх ствараецца фон апавядання. Памяншальна-ласкальныя суфіксы выконваюць двайную функцыю: з аднаго боку, выражаюць суб'ектыўную ацэнку героя, з другога, праз яго аўтар выражае свае эмоцыі.

Найбольш папулярнымі памяншальна ласкальнымі суфіксамі ў паэзіі Я. Коласа, Р. Барадуліна і А. Бадака з’яўляюцца:

**-к, -ок/ёк, -ік/ык, -ёч/оч, -ул, -ят, -чык, -еньк.**

Эмацыйна-экспрэсіўная роля памяншальна-ласкальных суфіксаў у дзіцячай паэзіі цесна звязана з творчай індывідуальнасцю паэтаў, з характарам іх мастацкага мыслення.